Аксана Данільчык

# ПАВУЦІНКА НА АГРЭСЦЕ

Вершы



Мінск
«Мастацкая літаратура»
2005

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-5
Д18

Мастак В. Г. Паўлавец
Для сярэдняга школьнага ўзросту

ISBM 985-02-07*96-5*

© Данільчык А. А., 2005
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2005

*Юнаму чытачу*

*І тое шчасце сонечнага дня,*
*дзе сон дрыжыць сцюдзёнаю вадою*
*і белай пенай хваля сырадою*
*вось-вось, здаецца, выскачыць з вядра,*
*дзе басанож абыдзеш сто шляхоу*
*у пошуках суніц і дзікіх кветак*
*і дзе нястомна заклікае лета*
*паплысці да высокіх берагоў,*
*дзе кожны ранак быццам божы дар*
*і вабяць вольным ветрам далягляды*
*і дзе хаваецца ў глыбінях сада*
*вішнёвых мрояў хітры гаспадар,*
*як гэты свет табе пераказаци,*
*як перадаць табе яго лагоду,*
*дзіцячых дзён шчаслівую свабоду*
*так хочацца табе падараваць.*

*Аутар*





## Зіма-матуля

Добры дзень, зіма-матуля!
Ліпам белыя кашулі
Падарыла,
А бярозам —
Снежных хустак ад марозу
Нарабіла.

Сонейка па снезе скача
І казыча твар дзіцячы
Жартаўліва.
Коўдру цёплую саткала,
Каб зямля адпачывала,—
Проста дзіва!

Усё вакол адпачывае,
А як толькі снег растане —
Зварухнецца.
Адляціць зіма далёка,
Пазяхне зямля глыбока
І прачнецца.

## Белы колер

Белы колер вакол. Белы колер.
Белы снег. Белатвары мароз.
Толькі промень ружовы над полем,
Толькі шэрае вецце бяроз.

Я раблю асцярожна, нясмела
Крок на белую тканку шляхоў.
Белы колер вакол, белы-белы,
Белы свет зіхатлівых снягоў.

## Люты

Ой, люты, ты зусім не люты.
Ааскава і пяшчотна сонца ззяе.
Бярозы-прыгажуні распрануты,
Стаяць, цярпліва вясновага чакаюць.
Куды ні глянь — усмешкі-весялушкі
На кожным твары, як праменні, ззяюць.
Шчабечуць дзеці. Заспявалі птушкі.
Вясну сваёю песняй сустракаюць.

## Добры дзень, вясна!

Добры дзень, мая вясна!
Добры дзень, чаканая!
Добры дзень, вясна-ясна!
Добры дзень, жаданая!

Заспявалі ручаіны,
Сонейка заззяла.
Пад крылом зямля буслінным
Так цябе чакала.

І нябёс празрыстых далеч,
І бяроз малеча
Так цябе, вясна, чакалі,
Выбеглі на стрэчу.

Дзе знайсці такія словы?
Іх шукаць не варта.
Уся зямля ў адзенні новым
З тонкіх нітак жартаў.

І алешыны галіны
Цягнуцца да сонца.
Свет вясёлы, гаманлівы,
Будзь жа ты бясконца!

* * *

Дождж за вокнамі — кап-кап
— Красавік засмуціўся.
Вецер клямкаю — ляп-ляп —
Цэлы вечар прасіўся.

Ён і грукаў, і клікаў,
І знянацку палохаў,
Ён і снегам абсыпаў,
І сваволіў патроху.

На двары халаднеча —
Я схаваюся ў хаце,
Так утульна на печы
Сярод скарбаў дзіцячых.

Кніжку вершаў дастану,
За старонкай старонка,
І святлей неяк стане,
Быццам раніцай звонкай,

Мо таму, што санет
Аб цяпле нагадаў,
Мо таму, што паэт,
Як і я, сумаваў.



* * *

Схавалі твары сарамліва
Бярозы ад вятроў крылатых.
На травы ў росах зіхатлівых
Глядзяць з-пад светлых дахаў хаты.
Гуляюць промні ў шыбе кожнай,
І ўсё на свеце сонца бачыць.
Мінае ранак асцярожны,
І дзень спякотны, дзень гарачы
З нябёс у возера глядзіцца.
Калоссе сілу набірае,
Каб потым сонцу пакланіцца.
Пакуль яно свой час чакае,
Палаюць чырванню суніцы.
Чарніцы дружна пазіраюць,
А сонца ў небе весяліцца —
Дарэмна праца не знікае.

**Вакацыі**

Лета звонкае, імклівае
І для нас цяпер прыйшло.
Сонца коціцца над нівамі,
Разліваючы цяпло.
А навокал рады сонейку
Птушкі, кветкі, матылі.
І маленечкія конікі
Песню дружна завялі.
Рэчка, луг, лясы шумлівыя
Расчынілі сто дзвярэй.
Верабейкі гаманлівыя
Заскакалі весялей.
Нас чакаюць справы новыя.
Лета — шчодрая пара.
На прыгоды на вясёлыя
Кліча лета са двара.

## Поўдзень

Калыхаюцца мятлікі млява,
Калыхаецца сонца над полем,
Непгга шэпчуць аблокам таполі,
Ледзь варушыць вятрыска атаву.
Сон салодкі над вёскай лунае,
Летні поўдзень і сам стаміўся,
Каля яблыні прыпыніўся,
Лёг і ціха адпачывае.

## Песня зязюлі

Кветкі застылі, быццам паснулі,
Неба чысцюткае — ні аблачынкі.
Усё як аблытана павуцінкай,
Чуецца толькі голас зязюлі.
Што ў тваёй песні? Поўдзень спякотны,
Чэрвень, што зноўку арэлі разгушкаў?
Песню спрадвечную дорыць мне птушка,
Светлай здаецца яна і маркотнай.
Стомлена рукі ўпадуць на калені,
Вочы заплюшчацца самі сабою,
Спыніцца сонца над галавою,
Спыніцца вецер, спыняцца цені,
Спыніцца час. Толькі ціхія гукі
Будуць звінець у паветры гарачым.
Што ты, зязюлька, сумуеш ды плачаш,
Плачаш па дзецях, плачаш па ўнуках?
Льюцца слязінкі над свежым пракосам,
Ненгга шчымліва мне сэрца кранае,
Песня ляціць і ў прасторы знікае.
Гэта зязюлька плача над лёсам.

## Родны край

Ну як у гэты край мне не ўлюбіцца?
Ну як бярозак тых не абдымаць?
Здаецца, кожнай кветцы пакланіцца
Гатова я. Ну як мне не спяваць,
Калі пяе бярозавае вецце
І вецер шэпча бэзу: «Даганяй!»
Што ні кажыце, а няма на свеце
Нічога прыгажэй за родны край.
За гэтую мурожную сцяжынку,
За сінь нябёс на золку над сялом,
За гнуткія танюткія галінкі,
За ліпу, што шапоча пад акном...

## Дожджык

Цесна вішні да яблыняў туляцца,
Серабрыстае лісце дрыжыць,
Па запыленай чэрвеньскай вуліцы
Аксамітавы дожджык бяжыць.
На траву, ад спякоты стамлёную,
Ён шпурляе прыгоршчы вады,
І вачамі глядзяць улюбёнымі
Маладыя гарэзы-сады.
Дождж бяжыць сярод ліп, сярод явараў,
Дождж бяжыць сярод гнуткіх калін.
І задыхала чыстымі марамі
Распасцёртае племя галін.
І амытая хвалямі цёплымі
Гаманлівая вёска стаіць.
За маімі празрыстымі вокнамі
Аксамітавы дожджык бяжыць...



## Вечар

Цудоўна часам вечаровым!
Ледзь чутна дыхаюць сады.
Упаў прамень святлом пунсовым
На картафлянік малады.
Нябёс валошкавая мара
Накінула чырвоны плашч,
Над лесам разлівае чары
Зязюлі адзінокі плач.
Сыходзіць дзень кудысьці ўдалеч,
Заззяў на небе маладзік,
І над абшарам гаспадарыць
Таемны зорны чараўнік.

## Летні ранак

Шматгалосы ясны летні ранак
Зазвінеў на сотні галасоў.
На заліты цёплым сонцам ганак
Я вярнуся з царства сініх сноў.

Подых ветру, лёгкі, нібы мара,
Прашапоча недзе угары,
Праляціць над чэрвеньскім абшарам
І заціхне ў лесе ў гушчары.

У залатых праменнях тонуць гоні.
Свету — канца-краю не відаць.
Я трымаю сонейка ў далонях,
Як агонь, праменьчыкі гараць.

## Аблачынка

Жытам зялёным пабегла сцяжынка.
Чысты, празрысты колер нябёс.
І адзінокую аблачынку
Вецер аднойчы з-за лесу прынёс.
«Дзе ж ты сяброваак сваіх пагубляла?
Хіба не сумна адной вандраваць?»
«Сумна? — яна мне тады адказала.—
Не, мне не сумна зямлю вывучаць.
Колькі я зведала, колькі спазнала,
Вольная воля — сяброўка мая.
Век мой нядоўгі — часіна настала,
Сотнямі кропель рассыплюся я».
І аблачынка далей паляцела,
Мне пакідаючы летні спакой.
Доўга яшчэ я услед ёй глядзела,
На развітанне махнула рукой...
Сонца павольна плыве над ракою,
Зыоў каласы абступілі сцяжышку.
Чэрвень. Спякота. Такою парою
Я ўспамінаю маю аблачынку.

## Дождж ідзе

Так даўно дажджоў мы чакалі,
Самі з леек гуркі палівалі.

Раптам хмары набеглі на неба.
Уздыхнула шчаслівая глеба,

Кроплі цяжкія прагна глытала,
Гром грымотны з дажджом сустракала.

Колькі лужынак з чыстай вадою —
Будзе радасці ўжо нам з табою!

Басанож пабяжым па вадзе.
Дождж ідзе, дождж ідзе, дождж ідзе!



## Суніцы

Лета напоўніла спёкай нябёсы,
Выжар у сонечных промнях іскрыцца,
Спіну сваю разгінае калоесе.
Пойдзем у лес, пазбіраем суніцы.

Тут прахалода, тут свет асаблівы,
Царства звяроў і птушыных паладаў.
Сёлетні год на суніцы ўрадлівы,
Змогуць усе іх збіраць-частавацца.

Плямкі святла і сунічныя шчочкі
Так упрыгожваюць мяккі імшанік,
Толькі збіраць іх даводзіцца моўчкі —
Таюць у роце за шарыкам шарык.

## Купалле

Купалінка, купалінка...
Вечар ясны, звонкі.
І вянок спляла дзяўчынка
З палявых рамонкаў.
На зямлю туман спусціўся,
Возера ў дрымоце.
Вось лясун заварушыўся
Недзе на балоце.
Выйдзе ён у час паўночны
Да лясной сцяжыны
І схавае твар свой змрочны
У кустах ажынаў.
Будзе там блукаць памалу,
Вартаваць, каб дзеткі
Не прыйшлі ды не сарвалі
Папараці кветку.

## Таполі

Добры дзень, мае таполі!
Як жывецца вам?
І аб чым шапоча голле
Ліпеньскім садам?

Што вам сніцца ночкай цёмнай
Ці падчас зары?
Ці гуляюць па-над Нёмнам
Буйныя вятры?

Тут і пальмы, тут і мора,
Ракавінак шмат,
Тут чужы далёкі горад,
Сіні далягляд.

Толькі згадваю міжволі
Родных дрэваў шум...

«Як вы там, мае таполі?» —
На пяску пішу.

* * *

Першы жнівеньскі вечар.
Ветрык — не дыхне.
І куст чырвоных парэчак
Лісцем не зварухне.

Да поплаву коціцца жыгга,
Валошкі спляліся з травой,
А неба празрыстым блакітам
Легла над галавой.

Легла ясна і светла.
Журботнае ўсё адышло.
Вітае позіркам ветлівым
Жнівеньскі вечар сяло.

## Калыханка

Спаць пара Алёне.
Не шапочуць клёны,
Не бруіць крынічка,
Легла спаць сінічка.
Дрэмлюць перапёлкі,
Мёд не носяць пчолкі.
Засынаюць кветкі,
Спаць кладуцца дзеткі.
Ветрык не гуляе,
Поўня ў небе ззяе.
Зоркі ў вокны свецяць,
Спаць кладуцца дзеці.
На двары ўжо ночка,
Ты заплюшчы вочкі.
Мяккая падушка,
Не спяваюць птушкі,
Не шапочуць клёны.
Спаць пара Алёне.

## Павуцінка на агрэсце

Павуцінка на агрэсце,
Павуцінка на парэчках,
Вераснёўскі жэўжык-вецер
Абрывае з ліп сардэчкі,
А замест усмешкі лета —
Подых восені няўлоўны.
Зацярушаны, сагрэты
Сад бабулін, промняў поўны.
Я пад яблыняй старою
Адшукаю яблык спелы,
Я люблю такой парою
Паблукаць па свеце белым.
Ён напоўнены спагадай
І пяшчотай адцвітання,
Гэта восень дорыць радасць
І надзею на вяртанне.
Павуцінкі восень песціць
І прыносіць іх з-за рэчкі,
Каб развесіць на агрэсце,
Каб развесіць на парэчках.

**Рабінка**

Юная рабінка
Да акна схілілася
І да шкла галінкай
Тонкай прытулілася.

Тужыць у палоне
Горада дажджлівага
Між бяроз і клёнаў
Школьніцай маўклівою.

Жоўкнуць, ападаюць
З кожным днём лісточкі,
Птушкі адлятаюць,
Халаднеюць ночкі,

Ды страсае вецер
На каралі дзецям
Поўныя далоні
Ягадак чырвоных.

* * *

Серабранка, Серабранка,
Чайкі лётаюць кругамі.
Цёплы вечар, светлы ранак,
Жоўты лісцік пад нагамі.

Гэта верасень ласкавы
Залацінкамі па вецці,
Залацінкамі па травах
Разліваецца па свеце.

Над вадою вербы гнуцца,
Аедзь прыкметны ветру рухі,
І далёкімі здаюцца
Маразы і завірухі.

## Бабіна лета

Восеьь у горадзе. З золатам клёнаў,
З сумам па леце, з барвовымі лісцямі
Восень прыйшла, і бульвары зялёныя
Фарбамі ўраз запалалі агністымі.
Бабіна лета. Сэрцу так хораша
Слухаць апошнія спевы птушыныя.
Восень гуляе па сонечным горадзе,
Стукае ў вокны гронкай рабінавай.
Ціха аблокі плывуць-праплываюць,
Сумна ўсміхаецца ясная далеч.
Дрэвы палаюць. Лісты аблятаюць.
Сонечных дзён засталося так мала.
Восень у горадзе...

* * *

Дзяўчынка збірае клянове лісце
У парку над ціхай самотнай ракой.
І пясціцца неба ў вадзе бы ў калысцы,
І вецер не хоча парушыць спакой.
Барвовае, жоўтае лісце, як мара,
Як быццам агеньчык, між пальцаў гарыць,
І крык жураўоў над туманным абшарам,
Над паркам, над рэчкай тужліва звініць.
За дрэваў сцяною на вузкай сцяжынцы
Кастрычнік стаіць — златарогі алень,
Клянове лісце збірае дзяўчынка,
А казку расказвае восеньскі дзень.

## Восеньскія сны

Восень — някліканы госць —
Зноў завітала да нас.
Восеньскіх мар прыгажосць —
Лісцяў рубінавых час.
Восеньскіх спеваў пара —
Хор незлічоных дажджоў.
Там, дзе палае зара,
Па-над прасторай палёў
Вецер струну зварухнуў,
Арфы пачуўся самот.
Лес-піяніст уздыхнуў
Россыпам восеньскіх нот.
Гэта сімфоній пара,
Чыстых, як слёзы твае,
Там, дзе палае зара,
Скрыпка тужліва пяе.
Чуецца ў восеньскіх снах
Вечнага Моцарта крок,
Казак цудоуных працяг,
Прага далёкіх дарог...



**Музычная школа**

Тут музыка гасцюе кожны дзень.
Бы першы раз, гляджу зачаравана,
Як націскае сонечны прамень
На клавішы старога фартэп'яна.

І з радасцю прыходзім мы сюды,
Дзе раскрываем гукаў таямніцы.
Я ведаю, што буду назаўжды
Музычнай школы ўдзячнай вучаніцай.

Я ціхенька адкрыю дзверы ў клас,
Мелодыя знаёмая пальецца.
Дык дзякуй вам, настаўнікі, ад нас
За гэты цуд, што музыкай завецца.

## Адлятаюць буслы

Адлятаюць буслы. Над сядзібамі роднымі
Чуцен крык развітання з зямлёй дарагой.
Адлятаюць буслы. І вачамі бяздоннымі
Іх праводзіць зямля. Над лясной цішынёй
Адлятаюць буслы. Чарнавокія ночанькі
Будуць з лісцем у пары над вёскай кружыць.
Адлятаюць буслы. Рыжай восені вочанькі
Будуць слёзы дажджоў над палеткамі ліць.

## Сяброўкі

Дрэў аголенае веццe.
Згасла восеньская далеч.
Развітанні птушак недзе
За туманамі прапалі.
Мы з табою ціха сядзем,
Месца на стале хапае.
Дзень кароткі ў лістападзе,
Хутка вечар наступае.
Невясёлы гэты вечар,
Агарнула цемра горад,
Па дварах гуляе вецер,
Пуста, змрочна, дождж і холад.
Кружыць восень над зямлёю,
Пад акном ліхтар міргае.
Ты са мною, я з табою
Зноўку цёплых дзён чакаем.

**На Каляды**

За акном мароз трашчыць, гурбы ды ільдзіны.
Зімні вечар раскідаў зоркі па палях.
Ой, мае калядачкі, белыя гардзіны,
Чыгунок з куццёю, сена летні пах.
Рада я, што бачу зноў хату дарагую.
Мак, аладкі, свежы хлеб, дотык любых рук...
І маленькаю зусім я сябе ад чую,
Буду слухаць дроваў трэск, ветру ў шыбу стук.
Стол прыбраны, час прыйшоў, каб усе адчулі,
Як сардэчнасць і спакой у душу ўвайшлі.
«Божа, дай за год прыждаць,— скажа зноў бабуля-
Хай жывецца-маецца добра на зямлі».



© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

**ЗМЕСТ**

*Юнаму чытачу*
Зіма-матуля
Белы колер
Люты
Добры дзень, вясна!
***Дождж за вокнамі — кап-кап...
***Схавалі твары сарамліва...
Вакацыі
Поўдзень
Песня зязюлі
Родны край
Дожджык
Вечар
Летні ранак
Аблачынка
Дождж ідзе
Суніцы
Купалле
Таполі
***Першы жнівеньскі вечар
Калыханка
Павуцінка на агрэсце
Рабінка
* * * Серабранка, Серабранка...
Бабіна лета

Данільчык А. А.
Павуцінка на агрэсце: вершы: для сярэд. шк. узросту/ Аксана Данільчык; маст. В. Г. Паўлавец. — Мн. : Маст, літ., 2005. - 31 с.: іл.
ISBN 985-02-0796-5.

Здараецца, што хлопчыкі і дзяўчынкі, асабліва тыя, што жывуць у горадзе, не звяртаюць увагі на прыгажосць акаляючай прыроды. А заўважаць няспынныя змены, якія ў ёй адбываюцца, радавацца кожнаму новаму дню, навучыцца быць назіральнымі на самай справе не менш цікава, чым бавіць час перад тэлевізарам або камп'ютэрам. Бо свет прыроды — жывы, рэальны, поўны паэзіі і характва. І ён неаднойчы парадуе вас цікавымі знаходкамі і ўражаннямі, як і гэтая кніга паэтэсы.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Бей)-5**

Літаратурна-мастацкае выданне
ДАНІЛЬЧЫК Аксана Аляксееўна
**ПАВУЦІНКА НА АГРЭСЦЕ**
Вершы
Рэдактар *У. М. Мазго*
Мастацкі рэдактар *К. С. Ракіцкі*
Тэхнічны рэдактар *Л. С. Зубец*

Стылістычны рэдактар *Д. Р. Лосік*